**Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах**

| не адасабляюцца: | адасабляюцца: |
|---|---|
| **1**. калі яны з’яўляюцца выказнікам або ўваходзяць у склад выказніка: *Вада ў рацэ нібы набрыняла свінцом. ( Т.Хадкевіч)* | на пісьме звычайна выдзяляюцца коскамі незалежна ад месца ў сказе і ўводзяцца ў сказ пры дапамозе злучнікаў **як, што, быццам, нібы(бы), нібыта, як бы, як быццам, чым:** *Дзяўчаты, нібы русалкі, карагоды водзяць.(П.Панчанка)* |
| **2**. калі ўваходзяць у склад устойлівых (фразеалагічных) словазлучэнняў: *Ян маўчаў. Сядзеў як аршын праглынуўшы. (Л.Арабей)* | калі адносяцца да ўказальных слоў **такі, так, такая**: *Вецер свішча так, як звер. ( Я.Колас )* |
| **3**. калі параўнальны зварот мае значэнне “ў якасці”: *Чмаруцьку ведалі ўсе як чалавека з вялікай фантазіяй. ( М.Лынькоў)* | коска ставіцца перад злучнікам **як** у спалучэннях **нехто іншы, як; не што іншае, як :** *На гарызонце віднеецца не што іншае, як горы. (Т.Хадкевіч)* |
| **4**. калі абедзве часткі параўнання выражаны адным і тым жа словам: *Дуб стаіць як стаяў. ( В.Вольскі)* | |
| **5**. калі перад параўнальным зваротам стаяць часціцы **не (ні), амаль,** прыслоўе **зусім** і некаторыя размеркавальныя злучнікі: *Вада была зусім як летняя. ( В.Вольскі)* | **ЗАЎВАГА:** |
| **6**. калі параўнальныя звароты ўводзяцца ў сказ спалучэннямі **больш як, больш чым ( не больш чым ), менш як, не бліжэй як, усё роўна як:** *Размова не спыніцца раней чым праз паўгадзіны. ( М.Лынькоў )* | зрэдку могуць адасабляцца працяжнікамі для таго, каб больш выразна паказаць, да якой часткі сказа яны адносяцца, ці з асаблівай сілай падкрэсліць характар параўнання: *Дзяўчына – бы ягадка тая.* |